**Навумовіч У.А. (Мінск)**

# Верлібры Максіма Танка ў кантэксце сусветнай паэтычнай традыцыі

Максім Танк – паэт еўрапейскага і сусветнага маштабу. Яго творчасць і дасягненні, асабліва ў асваенні і развіцці новых жанравых форм, нельга перааценіць. Ураджэнец Нарачанскага краю (в. Пількаўшчына Мядзельскага раёна), ён літаральна ўварваўся ў беларускую, найперш у заходнебеларускую паэзію. Гэта давала мажлівасць літаратурным крытыкам гаварыць, што заходнебеларускі народ падчас падзелу “па жывому” і без удзелу самога народа, быў “разарваны” на дзве палавінкі, усходнюю і заходнюю, меў усё ж на сваім духоўным узбраенні магутную зброю, але якую? Гэта была масава-дэмакратычная паэзія (масавая не ў значэнні колькасці паэтаў, а ў сэнсе выяўлення настрояў мас працоўнага люду – Васілёк, Пястрак, Таўлай). Адна толькі вёсачка Зачэпічы (“гняздо паэтаў” – У. Калеснік) паміж Дзятлавам і Лідай далі некалькіх творцаў з “няскоранымі” псеўданімамі – Пятрусь Граніт, Васіль Струмень, Герасім Прамень, Н. Жальба. А тут, наце вам, васпане, панове, – Максім Танк! І друкавацца пачаў з самвыдавецкага часопіса “з-за турэмных крат”, які так і называўся. “Пралом”, як пралом у турэмнай сцяне, у 1932 годзе, які выдаў разам з паэтам Я. Гарохам. Трыма зборнікамі ўвайшоў М. Танк у заходнебеларускую паэзію – “На этапах” (1936), “Журавінавы цвет” (1937), “Пад мачтай” (1938) і паэмай “Нарач” (1937).

Першы зборнік – паэзія змагання, “турэмная лірыка”, што гучала з-за лукішкоўскіх крат, “паэзія бунту”, дзе ў кожным радку чуюцца і бачацца кайданы і этапы, якім было і само жыццё паэта. Свабодалюбівыя матывы пераважалі.

Зборнік “Журавінавы цвет” – зашыфраваны, у ім бачыцца заглыбленне ва ўнутраны свет чалавека, у яго псіхалогію, узмацненне чалавеказнаўчага зместу. Такая паэзія патрабавала зусім іншай стылістыкі, інтанацый: яна загучала больш даверліва, роўна, а думкі аб волі і долі даводзілася “хаваць” у падтэкст. Напрыклад, колер спелых журавін – чырвоны. Яркім чырвоным палотнішчам разасланы яны на нарачанскай зямлі ўвосень. Увосень, як вядома, і адбылося ўз’яднанне ўсходніх і заходніх зямель Беларусі.

Трэці зборнік – “Пад мачтай” – меў філасофскае гучанне. Пад карабельнай сасной, як пад мачтай, адчуў сябе лірычны герой паэзіі М. Танка, на велізарным зямным караблі, зямным шары, на якім чалавецтву “плыць” удалячынь, у Сусвет. У кнізе выразная класічная яснасць, глыбіня. Тут праявіліся якраз тыя рысы паэзіі М. Танка ў галіне свабоднага верша –

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

верлібра, якія стануць вызначальнымі, істотнымі ва ўсёй творчасці паэта. Прага да свабоды, дэмакратычнасці, да справядлівасці, роўнасці, братэрства жывіла ўсю творчасць і само жыццё паэта, што і спарадзіла з’яўленне ў яго творчасці новай і нязвыклай для беларускай літаратуры жанравай формы – верлібра. “Быць чалавекам я рад. – Быць ім хацеў бы заўсёды”, – кажа паэт. Яму было ўсяго 30 з гакам гадоў, калі ён стаў хрэстаматыйным паэтам, “увайшоўшы” ў падручнікі выдатнымі творамі і не менш легендарнай біяграфіяй змагара за свабоду і незалежнасць. Родная Пількаўшчына, Нарачанскі край, любая беларуская зямля, хлеб на стале, хата, “пакрытая крыламі ластавак”, вокны “зашклёныя вачамі блізкіх”, парог “вычасаны з успамінаў” усіх тых, хто пераступаў у хату, “дзверы на завесах цвыркуновай песні”, сосны ля дома, поле, “накрытае рунню”, зорнае неба ў студні, рацэ і азёрах, дарога, якая просіць цішы, лес з ранішняй імжой, людзі і праца – вось вобразы паэтавай песні. Выказваючы сваё, роднае, блізкае і дарагое яму, беларускай па сваёй сутнасці нацыянальнай ідэі, Максім Танк станавіўся паэтам сусветнага значэння. “Я вырас, як і большасць нашых пісьменнікаў, у сям’і хлебаробаў, дзе сумленная праца ад цямна да цямна лічылася натуральным і прыроджаным абавязкам”, – прызнаваўся паэт. А яшчэ спавядаўся: “Я, здаецца, далучыўся да цыганоў, каб толькі павалачыцца па розных шляхах на зямлі ды паглядзець на свет”. Свет М. Танк адкрываў у вершах. Паэт шырокага творчага дыяпазону ён рашуча заняў трывалае месца ў кантэксце сусветнай паэтычнай традыцыі, стаўшы прызнаным мэтрам верлібра.

Верлібр (франц. vers libre – свабодны верш) заняў сваё трывалае месца ў амерыканскай і еўрапейскай літаратуры, найперш, англамоўнай. Свайму распаўсюджванню абавязаны ў XIX стагоддзі Фрыдрыху Гёрдэрліну, Уолту Уітмену, Сцівену Крэйну, Артуру Рэмбо, Жулю Лафоргу. Упершыню тэрмін “верлібр” увёў французскі паэт і крытык Кан у 1884 годзе. Рычард Олдзінгтон пісаў: “Мы не настойваем на тым, што верлібр – адзіны метад стварэння паэзіі. Але мы адстойваем права і свабоду паэтаў пісаць такім чынам”. У адрозненне ад канвенцыянальных вершаў (г.зн., вершаў, якія маюць абавязковыя прыкметы формы – метр, рыфма, ці хоць адзін з іх, напрыклад, рытм, інтанацыю), свабодны верш мае значную свабоду, аналітычную, філасофскую заглыбленасць з апорай на змест, думку, пачуцці. Сяргей Лук’яненка падкрэслівае: “Аднак, на самой справе напісаць добры верлібр аб’ёмам у некалькі радкоў нашмат складаней, чым любы “правольны” верш”. “Работа над верлібрам з’яўляецца нашмат цяжэйшай, чым над звычайным вершам, – адзначаў паэт-мадэрніст і крытык Томас Эліот.

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

Максім Танк стаіць у адным шэрагу мэтраў верлібра ў сусветнай паэзіі – У. Бранеўскага (Польшча), Н. Хікмета (Турцыя), П. Неруды (Чылі), В. Незвала (Чэхія), Я. Рыцаса (Грэцыя), А. Лундквіста (Швецыя), П. Элюара і Ж. Прэвера (Францыя), У. Маякоўскага (Расія), такіх класікаў, як А. Фет у рускай, Г. Гейнэ ў нямецкай, Р. Кіплінга ў амерыканскай літаратуры.

Родапачынальнікамі верлібра ў беларускай літаратуры можна лічыць Янку Купалу і Максіма Багдановіча. У вершы Купалы “А хто там ідзе?” знаходзім інтанацыі свабоднага верша. Максім Багдановіч у 1915 годзе піша верш-верлібр “Я хацеў бы спаткацца з Вамі на вуліцы”. Верлібр ёсць у творчасці і шматлікіх беларускіх майстроў мастацкага слова – такіх, як А. Лойка, Я. Сіпакоў, А. Разанаў, А. Вярцінскі, П. Макаль, С. Дзяргай, М. Стральцоў, В. Зуёнак. У М. Танка ў апошнія тры-чатыры дзесяцігоддзі творчасці верлібр стаў ледзь ці не адзінай формай мастацкага спасціжэння рэчаіснасці. Паэт Максім Танк – выдатны майстар верлібра ў беларускай паэзіі. З чаго нараджаецца паэзія? З узрушэння, з гулу, гуку, з дотыку да зямлі і чалавека, са здзіўлення, грукату, раскатаў грому. Скажам, душа растрывожылася, калі чалавек перажыў узбуджэнне, розум улавіў рытм, думку. Інтанацыя і сэнс далі гармонію, парадак, арганізаванасць радкам, роўнае і стройнае дыханне вершу. “Сто нябачных фотаздымкаў ноччу зняў на памяць гром”, – напісаў Я. Яўтушэнка. Верш-верлібр – гэта фотаздымак нябачнага, гэта рытмы нашага сэрца, хадзьбы, дыхання, біцця крыві ў жылах. Нездарма верлібры М. Танка так цудоўна перадаюць чалавечую працу, народжанае пачуццё. Верлібр – гэта сплаў думкі і пачуцця. “Верлібр падобны на сапраўдны верш як саксаул падобны на дрэва”, – пісаў А. Клышка.

Колькі бывае рытмаў? Рытмічны малюнак можа быць розным – з націскаў, фраз, паўзаў, гукаў, канчаткаў, строф, радкоў, паняццяў. М. Танк выкарыстоўвае разнастайную рытміку. У паэзіі М. Танка вялікую ролю адыгрывае кантэкст, разважанне. Верлібры М. Танка – філасофскія, аналітычныя. Думка ў іх разгортваецца па спіралі: “Я спытаў чалавека,/ які прайшоў праз агонь, / і воды, / і медныя трубы: / – Што самае цяжкае на гэтым свеце? І ён адказаў: / – Прайсці праз вернасць?”. Цудоўныя радкі! Больш ёміста, змястоўна, дакладна і вычарпальна пра чалавечае жыццё не скажаш. У адным з верлібраў паэт прызнаўся, што калыхаючы немаўля, маці прала кудзелю і спявала песню над калыскай сына ці дачкі. З таго часу кожны з нас, кажа паэт, разматвае нітку матчынай песні са свайго сэрца, баючыся яе парваць (верш “Закалыхваючы…”).

Верлібры М. Танка пабудаваны на нацыянальнай аснове. Паэт-наватар не пакінуў ані кроплі сумнення сваім апанентам, якія даказвалі, што беларускай мове не ўласціва форма свабоднага верша, што на рэалістычна-

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

бытавым канкрэтным фоне верлібр многае страчвае, што дэталізацыя і “прывязанасць” да зямлі не пасуюць умоўнай і адцягненай форме падобнай вершатворчасці. Глыбока нацыянальная аснова, жыццёвая канкрэтыка, нацыянальны каларыт і ўвага да мастацкай дэталі як сродку ўласна рэалістычнага жывапісу ўласцівы большасці верлібраў паэта. І няхай не зводзяць у зман лёгкасць, імправізатарская прырода верша – творы выпакутаваны ўсім нялёгкім жыццём паэта. Характэрны ў гэтых адносінах верлібр-экспромт на вечары да 70-годдзя творцы “О, каб гэта сякера…”, дзе чалавек, умудроны жыццёвым вопытам прыгадвае рэчы, з якімі сутыкаўся (рыдлёўка, кульбак, плуг, агонь) па жыцці са спадзёўкай, што яны маглі б загаварыць, дык тады навошта, падсумоўвае паэт, было б браць у рукі пяро. Пяром М. Танка “водзіць” беларускі народны дух, сэнс якога просты і зразумелы. Якія бываюць сэнсы? Вымысел, цвярозасць, рэалістычнасць, супрацьпастаўленне ідэальнага і рэальнага. Паэт шырока карыстаецца асацыятыўным мысленнем, карыстаецца ўмоўнасцю (ліст – поле, кніга – жніво). Дасягае патрэбнага эфекту, уражання нечаканасцю вобразаў, сутыкненнем самых розных паняццяў, думак, алагізмаў, вершы ўзнікаюць на паралелях, на паступовым разгортванні думкі па спіралі, у своеасаблівым душэўным напале, рытме, ладзе, эмацыянальным рэгістры.

М. Танк – паэт глыбока філасофскага складу, мысліцель. Свет верша-верлібра складаны, яго не выказаць адной фразай. У паэзіі М. Танка адбіліся спорная і гарманічная праца чалавека, яго паходка, спеў, хада, душэўнае захапленне, усё ўзгоднена з дыханнем, думкай, пульсам, стукам сэрца. Мускулістая думка, свежая, нечаканая. Верлібр М. Танка – гэта верш-развага, верш-думка, верш-ідэя, роздум. Даверлівая размова з чытачом (“Ну што мне пажадаць?”, “Пракладваючы дарогу”, “Мая хата з краю”, “Ударыў гром”, “Калі трэба была песня”, “І я знаў тых”, “Калі завеш мяне”, “Жадаю вам”). Нямала вершаў-верлібраў у паэта пра каханне, высокае, цнатлівае, вернае, сардэчнае, цёплае. Паэт сучасны ў развагах, час яго сааўтар і герой яго паэзіі, “святога рамяства”. Як у тых песнях, у адной з якіх герой “прысніў” каханую, і ростань, пра непадуладнасць часу жаночай прывабнасці. Самы жаданы і радасны дзень для паэта, калі ён адчуў і зразумеў, што яшчэ трэба шмат спазнаць, адкрыць.

Паэзія М. Танка – паэзія адкрыццяў, паэзія пазнання дабра і зла, паэзія ведаў, маральнай чысціні, даверу, спакою і грамадзянскай мужнасці. Зборнікі “Мой хлеб надзённы” (1962), “Глыток вады” (1964), “Хай будзе святло” (1972), “Дарога, закалыханая жытам” (1976), “За маім сталом” (1984).

Сугучнасць святла, хараства, дабрыні і маралі ўяўляюць сабой верлібры паэта, у якіх ён уздымае эстэтычныя праблемы часу, гаворыць пра

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

неабходнасць і прагу духоўнасці ў сучасным чалавеку. Любая праца пакідае свой плён, але праца паэта – асаблівая: “Той, хто дрэва садзіў, / Будзе веснім іх цветам; / Той, хто сеяў зярно, / Жытам закалосіцца; / Хто спагадай дзяліўся; / Ажыве ва ўспамінах; / Хто склаў песню народу, / Яе рэхам уваскрэсне”.

М. Танк – народны паэт Беларусі, лаўрэат Дзяржаўных прэмій СССР і БССР, Герой Сацыялістычнай працы, паэт-франтавік, ганаровы грамадзянін г. Мінска. Здзейсненае паэтам вартае сусветнага прызнання. А самае галоўнае, паэзія М. Танка носіць агульначалавечую каштоўнасць.

Літаратура

1. Навумовіч, У.А. Беларуская літаратура / У.А. Навумовіч. – 2-е выд. – Мінск : Вышэйшая школа, 2013. – 477 с.

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ